**Петрушкевіч А.М. (Гродна)**

# Вобраз мастака ў паэмах Янкі Купалы “Курган” і Максіма Танка “Люцыян Таполя”

Арфічныя вобразы трывала ўвайшлі ў беларускую літаратуру нашаніўскай пары. Гэтая старонка айчыннага пісьменства дасканала даследавана У.М. Конанам, які між іншага зазначыў: “Архетыпы чароўнага музыкі і евангельскага Лазара беднага ў абліччы песняра, гусляра, дудара, званара, урэшце, сацыяльнага бунтара, які склікае народ на Вялікі Сход, – гэта мастацкая сублімацыя абгрунтаваных прэтэнзіяў творцаў класічнай літаратуры на прароцтва, духоўнае і грамадскае лідарства, тварэнне віртуальнага свету ва ўмовах нерэалізаваных ідэалаў адраджэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Найбольш поўна гэта традыцыя выявілася ў паэзіі Янкі Купалы, Якуба Коласа, у творчасці іх паслядоўнікаў” [6, с. 398]. Сярод многіх вобразаў Янкі Купалы паўстае постаць гусляра з паэмы “Курган”. А між паслядоўнікаў нашаніўскіх класікаў, якія стваралі арфічныя вобразы, найперш вылучаецца творчаць Максіма Танка.

Вобраз Люцыяна Таполі, відавочна, самы значны з усіх вобразаў мастакоў, створаных паэтам. Невыпадкова, калі Анатоль Сыс пісаў верш “Маналог тутэйшага”, ахвяруючы яго Максіму Танку, то асацыяцыі ўзніклі менавіта з гэтым вобразам. Творца паўстае тут у іпастасі свайго героя:

Люцыян, уяві, ты адзін,
ты застаўся адзін на славяншчыне,
і нікога няма, паглядзі,
і нікога з Купалавай спадчыны… [8, с. 105]

Бо і сапраўды, як адзначыў даследчык беларускай паэмы М.М. Арочка, “у вобраз Люцыяна Таполі, народнага майстра, паэт укладваў шмат чаго ад уласнай самасвядомасці і бунтоўнасці натуры” [2, с. 166]. Да гэтага вобраза Максім Танк ішоў паступова, праз нарастанне драматызму, праз арыентацыю “на ўнутраны роздум… “Люцыян Таполя” з’явіўся іменна такім творам, які на шырокай пляцоўцы гістарычнага, умоўна ўведзенага ў задуму матэрыялу адкрываў магчымасці загаварыць пра мужнасць мастака” [2, с. 165–166].

У абодвух паэмах, знаёмячы з героямі, аўтары падкрэсліваюць веліч іх таленту, далучанасць да духоўнага жыцця людзей, якое ў многім і фармавалася пад уплывам іх творчасці. Бо, як у паэме “Курган”, гэта былі не проста песні, а напоўненыя глыбокім сэнсам думы, якія абуджалі людскія душы, клікалі да роздуму. Невыпадкова Янка Купала двойчы ў адной страфе ўжывае гэтае слова:

Акалічны народ гуслі знаў гусляра;
Песня-дума за сэрца хапала;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вакол гэтай думы дудара-званара
Казак дзіўных злажылась нямала [7, с. 53].

Герой Максіма Танка недарэмна мае клічку Багароб, бо галоўны ягоны занятак стварэнне і аздабленне храмаў:

Гэта быў адзін з майстроў вялікіх,
Звалі яго Люцыян Таполя,
А па клічцы проста Багароб [9, с. 198].

Ён тварыў на зямлі боскае, але набліжаў нябеснае да зямнога, бачачы найвялікшую прыгажосць менавіта ў людзе тутэйшым, які стварае скарбы, багацце гэтага краю, які творыць тут красу, падобную райскай. Таму і паўставалі небажыхары падобнымі “да сялян смаргонскіх, да вілейскіх лесарубаў, рыбакоў”. Сапраўды, па вобразу і падабенству да красы несмяротнай, паўстае выява дзяўчыны Тэклі, каханай творцы, якой ён праспяваў сваю Песню песняў.

У паэме Максіма Танка таксама падкрэсліваецца асэнсаванае імкненне героя стварыць вартае, што перажыве час. Аўтар выкарыстоўвае гэтае ж паняцце – дума. У мары Люцыяна Тапалі выказана мара самога творцы. Слушна напісаў пра гэта М.М. Арочка: “Неспакойная дума не пакідала ні паэта, ні яго героя – стварыць “сказ” пра запаветнае, споўніць сваё эстэтычнае прызначэнне, выяўляючы рэальны стан рэчаў” [2, с. 166]:

Дума неспакойная жыла ў майстра:
Ён хацеў пакінуць пакаленням
След жыцця свайго,
Сваіх пакут,
Сказ пра мары,
Пра свае імкненні... [9, с. 205]

Талент мастакоў знаходзіць водгук, бо яны пазначаны незвычайнай сілай уздзеяння на людскія душы, на ўсё жывое і нежывое (згадаем, як успрымаецца песня Гусляра). Таму і адбываюцца гіпербалізавана-неверагодныя, фантастычныя пераўтварэнні, мастак становіцца сапраўдным чараўніком. Так, пад рукамі Люцыяна Тапалі

Бы ад нейкіх чараў,
Ажывала нават нежывое,
Немагчымае рабілася магчымым:
Гнуўся камень,
А з звычайнай цэглы,
Быццам з бронзы,
Паўставалі здані… [9, с. 206]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У абедзвюх паэмах героям-творцам, носьбітам высокага, нябеснага супрацьпастаўлены вобразы тыранаў, што імкнуцца выкарыстаць таленты мастакоў, падпарадкаваць іх сваёй волі, а няскораных знішчыць. У паэме Янкі Купалы гэта князь, у паэме Максіма Танка сілы зла ўвасабляе біскуп Сямашка. Чаму менавіта гэты вобраз, які мае прататыпам гістарычную асобу? Безумоўна, паэт добра ведаў пра яго “заслугі”, пра антынародны і антыбеларускі (аперуючы паняццямі сённяшняга часу) характар ягонай дзейнасці. Гэта адступнік ад сваёй веры, які быў пракляты нават сваёю сям’ёй. Сёння ў сувязі з задумай РПЦ кананізаваць мітрапаліта Сямашку ўзнікаюць шматлікія дыскусіі. Немажліва не пагадзіцца з аўтарам аднаго артыкула, які доказна даводзіць, што гэтая асоба непасрэдна спрычынілася да знішчэння нашай царквы, самастойнай беларускай мітраполіі, якая існавала больш за 500 гадоў. Яшчэ М.М. Арочка, пішучы пра прататып героя, нагадаў: гэта быў той Сямашка, “што паліў у Жыровіцах старадрукі, кнігі” [2, с. 166]. І не толькі кнігі, але і “тысячамі паліў і старыя беларускія праваслаўныя і ўніяцкія абразы” [1, с. 268], творы нашых люцыянаў таполяў, бо Максім Танк падкрэслівае, што ягоны герой – “адзін з майстроў вялікіх”, адзін з многіх, што тварылі народную культуру. Выснова, якую робіць аўтар артыкула, цалкам стасуецца з вобразам, створаным паэтам: “З пункту гледжання свядомага беларуса (без розніцы веравызнанняў) мітрапаліт Іосіф Сямашка мае ацэньвацца адназначна: гэта быў знішчальнік самастойнасці беларускай мітраполіі, а таксама магільшчык беларускай мовы і культуры” [1, с. 268].

Апісваючы агляд біскупам святыні, ягоную нянавісць да мастака, абурэнне, гнеў, выкліканы творам-цудам, якія цешылі людскія душы, аўтар ставіць рытарычныя пытанні: “Што святы айцец благое ўбачыў, Што ўзняло яго гнеў непамерны?” Адказ зразумелы: гэта былі творы народнага мастака, творы, узгадаваныя гэтай зямлёй, гэтай культурай, гэтай царквой. А Сямашка паставіў за мэту знішчыць усё гэта. Таму Максім Танк і адлюстраваў біскупа Сямашку тыранам, які загадвае майстру –

> Самаму Таполю знішчыць твор свой
> І, пад страхам пекла і пракляцця,
> Цэлых дзесяць год адбыць пакуты
> І не брацца за сваё майстэрства [9, с. 204].

Такое пакаранне для мастака горшае за смерць. Але творца меў сілу перажыць і гэта, каб вярнуцца праз доўгія дзесяць гадоў і зноў здзіўляць зямлю і неба сваім майстэрствам.

Магчыма, Люцыян Таполя паступіў не зусім у адпаведнасці з хрысціянскімі канонамі, не дараваўшы ворагу ягоны грэх, выкарыстаўшы свой талент дзеля помсты. Але гэта невымернае з зладзействамі біскупа

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сямашкі. Учынак творцы, на нашу думку, нельга вытлумачыць толькі “паводле прынцыпу: помста жыцця – помста мастака, як у народных казках. Назло саноўнаму артадоксу Люцыян Таполя дазволіў сабе поўную свабоду творчасці” [5, с. 72].

Пакараны не столькі “саноўны артадокс”, не проста тыран, а носьбіт зла, служка д’ябла. Карае яго не проста чалавек, а той, каго паслала Неба як свайго пасланніка, што павінен даносіць люду вышэйшую красу і праўду, якая ў тым, што асобы, падобныя Сямашку, – гэта пякельныя пачвары. Такім чынам, мастак не проста карае за ўчыненую яму крыўду, а выконвае волю Неба. У кульмінацыі паэмы паўстае ўзведзены Люцыянам Таполем храм, у цэнтры якога пякельны карагод пачвараў, між якімі пазнавальны і сам біскуп. Самае страшнае для ворагаў чалавецтва – гэта жывая вечная душа і думка, што нараджаецца ў людской свядомасці. Таму ўдзельнікі гэтага пякельнага карагода

І паўзуць угору
Па душу, па думку чалавека,
Што, як сонца, слепіць вочы ім.
Толькі не спыніць палёту думы
І век розуму не пагасіць ім –
Чорным сілам пекла [9, с. 207].

Князь з паэмы Янкі Купалы таксама ўвасабленне сілаў зла, носьбіт д’ябальскага, пякельнага. Як слушна заўважыў У.В. Гніламёдаў, “па сучасных паняццях, ён стварыў свой культ. Карацей кажучы, перад намі тыран, у вобразе якога адлюстраваліся не толькі антынародныя і антыдэмакратычныя сілы, але і сілы нацыянальнай здрады і нігілізму. Пазіцыі князя і мастака несумяшчальныя” [3, с. 57]. Усё гэта цалкам характэрна і вобразу біскупа Сямашкі.

У гэтым сэнсе падаецца даволі спрошчаным наступнае ўспрыняцце вобраза песняра ў творчасці Купалы: ён “не служыцель муз, не барэц, не богаабраннік, а пясняр, адухоўлены ідэяй служэння народу” [4, с. 218]. На прыкладзе вобраза Гусляра якраз і можна сцвярджаць, што ён змагар, які моцай духу свайго перамагае злыя сілы. Ён богаабраннік, які падпарадкаваны адно Небу. Недарэмна ж мастак смела заяўляе князю: “Небу справу здае сэрца, думка мая, / Сонцу, зорам, арлам толькі роўна”. І князь сам разумее, хто перад ім, таму і звяртаецца адпаведна: “Гэй ты, сонцу раўня”. Загад князя закапаць Гусляра жывым у зямлю – гэта тая ж самая спроба злой сілы знішчыць сонца. Але, як і ў паэме Максіма Танка, “век розуму не пагасіць ім”, не знішчыць думу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Святыня, збудаваная Люцыянам Таполем, – гэта тая ж лебядзіная песня мастака, як і песня Гусляра, праспяваная на княскім балі. Песня велічы, праўды і нязгоды. Бо ні адзін, ні другі з творцаў не сталі на шлях змовы з ворагам людскасці. Адначасна гэтая святыня, узведзеная Люцыянам Таполем, – гэта самы дасканалы помнік творцу. Так, як і курган – помнік Гусляру, насыпаны на вякі.

Літаратура


1. Абламейка, С. Палац за акном у восень / С. Абламейка / Дзеяслоў. – 2012. – № 3. – С. 261–277.

2. Арочка, М.М. Максім Танк: жыццё ў паэзіі / М.М. Арочка. – Мінск : Нав. і тэхніка, 1987. – 272 с.

3. Гніламёдаў, У.В. Янка Купала: новы погляд : дапам. для настаўніка / У.В. Гніламёдаў. – Мінск : Нар. асвета, 1995. – 176 с.

4. Івашын, В. Тады з'яўляюцца пракрокі / В. Івашын / Полымя, 1992. – № 7. – С. 215–226.

5. Калеснік, У. Максім Танк : нарыс жыцця і творчасці / У. Калеснік. – Мінск : Маст. літ. – 189 с.

6. Конан, У. Хрысціянскія каштоўнасці беларускай літаратуры / У. Конан / Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. навук. арт. – Гродна, 2008. – С. 397–404.

7. Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск : Маст. літ., 1999. – Т. 6 : Паэмы. Пераклады. – 2001. – 399 с.

8. Сыс, А. Пан лес / А. Сыс. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 111 с.

9. Танк, М. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Т. 7 : Паэмы. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 368 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ